**Выкладчык кафедры філасофіі БДПУ,**
**Таркан І.І.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прычыны краху мультыкультуралізму і перспектывы міжкультурных адносін.

На прыканцы 2010 – пачатку 2011 гг. Канцлер Германіі Ангела Меркель, прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі і прэмьер-міністр Велікабрытаніі Дэвід Камерон афіцыяльна аб'явілі аб правале палітыкі мультыкультуралізму ў сваіх дзяржавах і неабходнасці адказа ад яе ў вырашэнні міжрасавых пытанняў. Мультыкультуралізм падвергся крытыцы не толькі ў краінах Еўропы, у якіх грамадзянская дзяржава традыцыйна атаясамлівалася з нацыянальна гамагенным грамадствам. Мультыкультуралізм стаў аб'ектам крытыцы таксама ў “іміграцкіх краінах” – США і Аўстраліі. У сапраўдны момант толькі Канада працягвае прытрымліваецца мультыкультуралізму як адзінай стратэгіі міжкультурнага ўзаемадзеяння. Паўстае пытанне, чаму мультыклуьтуралізм, які быў галоўнай ідэалогіяй рэгулявання міжэтнічных і міжканфесіянальных адносін у краінах заходняга грамадства на працягу больш чым трыдцаці гадоў, перажывае зараз глыбокі крызіс?

У філасофскім плане ідэе мультыкультуралізму папярэднічала канцэпцыя культурнага плюралізму, развітая ў 1910 – 1920-я гг. і стаўшая шырока папулярнай в 1940-я гг. Тэрмін “культурны плюралізм” быў уведзены амерыканскім філосафам Хорасам Каленам у кнігe “Дэмакратыя супраць Плавільнага катла” (1915), які даказваў што культурная разнастайнасць і нацыянальнае адзінства не супярэчаць адзін аднаму. Больш за тое, этнічны і расавы плюралізм узмацняюць цэласнасць амерыканскай нацыі [7]. Пад уплывам работы Калена, Рэндальф Боурн напісаў артыкул “Транснацыянальная Амерыка” (1916), у якім адкінуў канцэпцыю “плавільнага катла” – асіміляцыі імігрантаў у англа-саксонскую культуру, і абгрунтаваў, што ўзаемадзеянне іміграцкіх культур павінна прывесці ў перспектыве да стварэння транснацыянальнага грамадства, якое Боурн

называў “касмапалітычнай Амерыкай” [4]. У 20-я гг. уклад у развіццё канцэпцыі культурнага плюралізму быў зроблены філосафам Аленам Локам, выдаўшым зборнік эсэ афраамерыканскіх і афрыканскіх мысляроў “Новы негр” (1925), які паклаў пачатак культурнаму руху, вядомаму як Гарлемскі рэнесанс. Лок выдвігаў ідэю барацьбы чарнаскурага насельніцтва за культурную і сацыяльную роўнасць с белымі [5, p. 134]. У 1940-я гг. канцэпцыя культурнага плюралізму развівалася ў рамках філасофіі амерыканскага прагматызму. Джон Дзьюі ў сваіх працах параўноўваў культурную прастору грамадства з сімфоніяй ці салатніцай культур. У адрозненні ад цігля ў салатніцы кожны элемент прадстаўлены асобна: ён суіснуе з другімі элементамі і не змешваецца з імі [3, с. 51].

У 1960-я гг. у заходнім гарамадазнаўстве канцэпцыя культунай разнастайнасці ці мультыкультуралізму поўнасцю выцясняе асіміляцыйныя тэорыі. Гэты было звязана з пераходам да постмадэрнісцкага дыскурсу ў заходняй філасофскай думцы, якая адкідвала лінейнасць і стадыяльнасць развіцця культуры і, у супрацьлегласць гэтаму, прызнавала аўтаномнае існаванне кожнай культуры. З другога боку, пераход да мультыкультуралізму быў абумоўлены аб’ектыўнымі сацыяльнымі фактарамі. Да іх адносяцца прызнанне грамадзянскіх правоў этнічных меньшасцяў ў 60 – 70-я гг., якія адбыліся з прычыны асуджэння расізму ў Еўропе і ЗША. Яшчэ адным важным фактарам, які садзейнічаў увядзенню мультыкультуралізму, стала ўзмаценне патока таннай рабочай сілы з былых калоній і паўкалоній, у якой востра мела патрэбу прамысловасць заходнееўрапейскіх краін пасля заканчэння другой сусветнай вайны. У выніку гэтых змяненняў, у 70-я гг. мультыкультуралізм афармляецца ў выглядзе ідэалагічнай праграмы міжкультурных адносін ва ўсіх заходніх краінах.

Аўтары канцэпцыі мультыкультуралізму выступалі за захаванне этнічнымі меньшасцямі сваёй культурнай ідэнтычнасці, каштоўнасцей і звычаяў, і адкідвалі іх асіміляцыю. У аснове мультыкультуралізму ляжыць талерантнасць, якая складаецца ў патрабаванні паралельнага суіснавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культур. У супрацьлегласць асіміліцыйным канцэпцыям, такім як “плавільны кацёл”, у мультыкультуралізме інтэграцыя этнічных меньшасцяў у сацыяльную структуру і іх асіміляцыя разглядаюцца як нятоесныя паняцці. Гэта значыць мультыкультуралізм не адмаўляе інтэграцыю, але пры гэтым падкрэслівае неабходнасць захавання аўтаномнасці кожнай культуры, існуючай у грамадстве.

Развіццё мультыкультуралізму ў тэорыі і на практыцы ў “імігранцкіх” і “нацыянальных” дзяржавах набывае свае спецыфічныя асаблівасці. У канадскім, амерыканскім і аўстралійскім мультыкультуралізме традыцыйна ставілася пытанне аб інтэграцыі ці грамадзянстве імігрантаў, у той час як у еўрапейскім мультыкультуралізме такое пытанне не ўзнікала аж да канца XX ст. У Канадзе, ЗША і Аўстраліі імігранты ўспрымаліся как неад’емная частка грамадства, якая папаўняла патрэбу ў кваліфікаванай і некваліфікаванай рабочай сіле, а таксама ўзбагачаючай культурную прастору грамадства. У некаторых краінах, такіх як ЗША, прыхільнікі мультыкультуралізму выдвігалі патрабаванне выдзялення этнічным і рэлігйным меншасцям асобых сацыяльных прывілеяў для папярэджання дыскрымінацыі. Гэтая практыка атрымала назву пазітыўнай дыскрымінацыі [6]. У сваю чаргу, у еўрапейскіх дзяржавах панавала меркаванне, што імігранты прыбываюць у Еўропу толькі на час. Еўрапейскі мультыкультуралізм ніколі не засноўваўся на ідэе культурна плюралістычнага грамадства. Ідэал Еўрапейскіх краін, класічным прыкладам якіх з’яўляюцца Францыя і Германія, прадстаўлены этнічна гамагеннай дзяржавай. У еўрапейскім палітычным дыскурсе імігрантаў заўсёды называлі “гастарбайтарамі”, што літаральна можна перавесці як “гасьцючы работнік”. Лічылася, што імігранты павінны альбо асіміляваца (французская мадэль), альбо вярнуцца на радзіму (нямецкая мадэль), таму праблема іх уключэння ў нацыянальнае грамадства не ставілася.

Хоць з 70-х гг. мультыкультуралізм заставаўся пануючай ідэалогіяй міжкультурных адносін ва усіх краінах заходняга грамадства, тым не менш на працягу ўсяго свайго існавання ён падвяргаўся крытыцы як левымі, так і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

правымі інтэлектуаламі. У 90-я гг. мінулага стагоддзя гэтая крытыка ўзмацнілася, а ў пачатку XXI ст. палітычныя лідэры прізналі неэфектыўнасць мультыкультуралізму і сталі гаварыць аб неабходнасці перахода да новай ідэалогіі. Тут варта паставіць пытанне, якія прычыны крізісу мультыкультуралізму і ці існуюць альтэрнатыўныя мадэлі міжкультурных адносін?

Мультыкультуралізм традыцыйна быў аб’ектам крытыцы зправа, у першую чаргу неалібералаў, якія бачылі ў ім адну з галоўных прычын падрываючых моцную нацыянальную дзяржаву. Абвяшчаючы культурную разнастайнасць, мультыкультуралізм на практыцы прыводзіць да разбурэння адзінай культурнай прасторы, якое цягне за сабой сацыяльную і палітычную дэзінтэграцыю грамадства [2]. Згодна з неалібераламі, ва ўмовах узмацняючыгся іміграцыйных патокаў з краін, якія развіваюцца, у індустрыяльна развітыя заходнія краіны, далейшае прымяненне палітыцы мультыкультуралізму становіцца па-сапраўднаму пагрозлівым мерапрыемствам, вынікам якога можа стаць разбурэнне дзяржаўнай цэласнасці. У 90-я гг. мультыкультуралізм стаў падвяргацца крытыцы з боку левых інтэлектуалаў, якія адзначаюць амбівалентны характар дадзенай канцэпцыі. З аднаго боку, абвяшчаюцца прынцыпы культурнай дэмакратыі і права меньшасцяў на захаванне сваёй ідэнтычнасці, але з другога боку, культурная ідэнтычнасць зводзілася да знешніх этнічных асаблівасцяў, такіх як вопратка і рэлігійныя вераванні. Гэта значыць доступ да грамадзянскіх правоў грамадства заставаўся зачыненым для меншасцяў [3, с. 56].

Каб зразумець гэтую амбівалентнасць мультыкультуралізму, трэба звярнуцца да структуры капіталістычнага грамадства і разгледзець яго галоўныя элменты і іх функцыі. У тэорыі свет-сістэмнага аналізу капіталізм абгрунтоўваецца як сістэма, гэта значыць грамадства, унутраная арганізацыя якога дазваляе яму ажыццяўляць функцыю самаўзнаўлення. У якасці галоўных складаючых кампанентаў капіталізму вылучаюцца цэнтр, паўперыферыя і перыферыя. Выконвая пэўныя функцыі і ўзаемадзейнічая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адна з адной, яны забяспечваюць пастаянны рост прыбытку, што з'яўляецца сутнасцю капіталістычнага грамадства. Сфера цэнтра ўключае ў сябе тыя сацыяльныя групы, дзякуючы якім ажыццяўляецца назапашванне капіталу і яго рамеркаванне. У сферы перыферыі адбываецца вытворчасць тавараў і паслуг. У яе ўваходзіць так званая некваліфікаваная рабочая сіла, а таксама такая сацыяльна-эканамічная адзінка як "хатняя гаспадарка", якая уключае жанчын, дзяцей і старыкоў, труд якіх не аплачваецца. У карысць перыферыі размяркоўваецца мінімальная колькасць капіталу. Перыферыя выконвае вельмі важную функцыю, паколькі менавіта ў ёй адбываецца вытворчасць прыбавачнага кошту, гэта значыць прыбытак. Паўперыферыя выступае ў ролі спажыўца выробленых тавараў і паслуг і ўключае сацыяльныя групы, вядомыя як "спецыялісты" ці сярэдні клас: работнікі адукацыі, аховы здароўя, кіраўнікі, інжэнеры, кваліфікаваныя рабочые і інш. У паўперыферыю капітал размяркоўваецца ў ывглядзе зарабатнай платы, якая дазваляе ажыццяўляць збыт прадукцыі і паслуг.

Паколькі капітлаізм з'яўляецца антаганістычным гарамадствам, так як прадугледжвае адчужэнне перыферыі ад матэрыяльных і духоўных благ, паўстае пытанне, з дапамогай якога механізму ажыццяўлялася інтэграцыя перыферыі ў структуру капіталістычнай мір-сістэмы? Імануіл Валерстайн і Эцьен Балібар у сумеснай працы "Раса, нацыя, клас" раскрываюць значэнне расісцкай ідэалогіі ў гэтом дачыненні. Аўтары разглядаюць расізм як прынцып капіталістычнай ідэалогіі, легітымізуючай няроўнасць. Апеліруя да біялагічнага ці культурнага дэтэрмінізму, расізм навязваўся як форма самасвядомасці саміх жа імігрантаў. Адсюль вынікала, што імігрант пазбаўляўся ўсялякай магчымасці на пратэст, паколькі ўласнае маргінальнае становішча ўсвядамлялася ім як натуральная праява яго светапоглядных перакананняў і каштоўнасных арыентыраў, а не следства сацыяльна-эканамічных супярэчнасцяў. Усведамленне імігрантам уласнай чужасці, далучэнне сябе да этнічнай меншасці, апраўдвала яго ізаляцыю з сферы грамадзянскіх правоў. Дадзены феномен у свет-сістэмным аналізе атрымаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

назву "этнізацыі рабочай сілы". Расізм, тым самым, узаконьваў дзяленне на багатых і бедных, грамадзян і неграмадзян, у сацыяльнай структуры капіталізма. Аднак было б памылкай атаясамляваць расізм толькі з ксенафобіяй. Бо для таго, каб імігрант добраахвотна інтэграваўся ў грамадтсва на становішчы маргінала, адмаўляючыся ад пратэсту, былі патрэбны нейкія дадатковыя падставы, падсілкоўваючыя яго веру і надзею ў грамадства.

Нараўне з ксенафобіяй расізм таксама прадугледжвае выкарыстанне ўніверсалісцкіх дыскурсаў, якія абапіраюцца на ідэалы свабоды і роўнасці [1, с. 263 – 264]. Дадзеныя дыскурсы падмацоўваліся адпаведнай сацыяльнай практыкай, якае дазваляла этнічным меншасцям інтэгравацца ў грамадства. Хоць гэтая практыка дазваляла меншасцям прасоўвацца ўверх па сацыяльнай іерархіі, тым не менш яны ніколі не ўраўноваліся ў грамадзянскіх правах са "спецыялістамі", якія знаходзіліся на ўзроўні паўперыферыі. Здольнасць расізму адаптаваць універсалісцкія дыскурсы, паказвае на тое, што ва ўмовах капіталізму, любыя ліберальныя канцэпцыі, у цэнтры ўвагі якіх аказваюцца праблемы няроўнасці культур і пошук шляхоў іх пераадолення, непазбежна аказваюцца амбівалентнымі. З аднаго боку, гэтыя канцэпцыі ўключаюць у сябе прынцыпы культурнай дэмакратыі, а з другога – апраўданне ксенафобіі.

Мы лічым, што супярэчлівы характар мультыкультуралісцкай ідэалогіі, тлумачыцца амбівалентнасцю капіталістычнай свет-сістэмы. На працягу свайго трыццацігадовага існавання ў якасці ідэалогіі міжрасавых адносін мультыкультуралізм толькі фармальна аб'яўляў роўнасць культур, аднак на практыцы прадстаўнікі этнічных меншасцяў заўсёды абмяжоўваліся ў грамадзянскіх правах. Прыняцце мультыкультуралізму меншасцямі засноўвалася на двух момантах. Па-першае, мультыкультуралізм апеляваў да іх знешніх асаблівасцяў (вопратке, традыцыям, паводзінам і інш.), паказваў на іх ідэнтычнасць і тым самым ствараў ілюзію культурнай дэмакратыі. Па-другое, гэта было абумоўлена стабільным эканамічным развіццём капіталістычнай мір-сістэмы ў 50 – 70-я гг., што дазваляла размяркоўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

частку матэрыяльных благ на карысць меншасцяў у выглядзе розных сацыяльных праэктаў, такіх як будаўніцтва жылых раёнаў з усёй неабходнай інфраструктурай. Аднак з 80-х гг, калі пачаўся чарговы крызіс капіталізму, адбываецца рэзкае скарачэнне бюджэта на сацыяльныя праграмы, што адлюстравалася ў першую чаргу на тых гарадскіх раёных, якія былі заселены этнічнымі меншасцямі. У 80 – 90-я гг. у Еўропе і ЗША ўсё больш праяўляецца разрыў паміж правам меншасцяў на захаванне сваёй культурнай ідэнтычнасці і доступам да грамадзянскіх правоў.

У цяперашні час міжрасавыя канфлікты сталі адной з галоўных сацыяльных праблем заходняга грамадства, якія набываюць масавы і жорсткі характар. Як было адзначана ў пачатку артыкула, у 2010-2011 гг. у шэрагу заходніх дзяржаў, у тым ліку ў "іміграцкіх краінах", было аб'яўлена аб правале палітыкі мультыкультуралізму і неабходнасці перахода да больш жорсткага курсу ў дачыненні да імігрантаў. У грамадазнаўчых навуках і афіцыяльным палітычным дыскурсе ў апошні час вялікую папулярнасць набыла канцэпцыя сутыкнення цывілізацый, сэнсам якой з'яўляецца вяртанне да ксенафобіі, з дапамогай якой плануецца ізаляваць і засцерагчы індустрыяльна развітыя краіны ад астатняга свету. З іншага боку, не меншую папулярнасць мае канцэпцыя дыялога цывілізацый, адной з задач якой складаецца ў арганізацыі раўнапраўнага дыялога культур у вырашэнні глабальных праблем сучаснасці. На наш погляд ідэя дыялога культур будзе мець сэнс толькі ў тым выпадку, калі ў якасці сваёй галоўнай мэты яна абвясціць трансфармацыю капіталістычнай мір-сістэмы ў іншую сацыяльную сістэму, заснаваную на прынцыпах сацыяльнай дэмакратыі. У адваротным выпадку, ва ўмовах капіталізму, гэтая канцэпцыя ператварыцца ў чарговае ідэалагічнае прыкрыццё для сацыяльанай няроўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура.**


1. Балибар Э. Раса, нация, класс. Двусмысленные идентичности: пер. с фр./ Э. Балибар, И. Валлерстайн; ред. О. Никифорова и П. Хицкого. – М.: «Логос», 2004. – 288 с.
2. Кристол, Ирвинг. Трагедия «мультикультурализма»/ Ирвинг Кристол// www.russ.ru/pole/Tragediya-mul-tikul-turalizma. – Дата доступа: 14.10.2011.
3. Соколовский, С.В. К критике политики мультикультурализма/ С.В. Соколовский// Этнометодология: проблемы, подходы, концепции: сб. ст.; вып. 14; ред. А.А. Пископпель. Сб. Статей. – М.: Министерство культуры Российской Федерации, 2009. – 146 с.
4. Bourne, Randolf. Trans-National America/ Randolf Bourne// www.swarthmore.edu/SocSci/rbannis1/AIH19th/Bourne.htm. – Дата доступа: 14.10.2011.
5. Buck, Christopher. Alain Locke: faith and philosophy/ Christopher Buck. – 1st ed. – Kalimat Press, 2005. – 281 p.
6. Fullinwider, Robert. Affirmative Action/ Robert Fullinwider// http://plato.stanford.edu/entries/affirmative-action. – Дата доступа: 14.10.2011.
7. Kallen, Harace M. Democracy Versus the Melting-Pot. A study of American Nationality/ Harace M. Kallen// www.expo98.msu.edu/people/Kallen.htm. – Дата доступа: 14.10.2011.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ